растлумачыў ён. — Лекцыі, лекцыі, лекцыі... Усё жыццё аддаў універсітэту — студэнт, выкладчык, загадчык кафедры, дэкан. Не Бог ведае якіх вяршынь дасягнуў, затое, здаецца, і чужых крэслаў ніколі не займаў.

Гадзіны праз дзве Віктар сказаў, што на сёння ўсё.

— А можна паглядзець, што ў вас атрымалася? — далікатна папрасіла Вольга Іванаўна?

— Прабачце, я стараюся нікому не паказваць свае работы, пакуль іх не закончу.

— Гэта звязана з нейкай прыкметай?

— Калі мастацтва перастае быць таямніцай, яно перастае быць мастацтвам, — усміхнуўся Віктар, правёў гасцей да ліфта і з лёгкім шкадаваннем глядзеў, як разам з імі ў кабіну залятаюць рознакаляровыя матылькі.

У наступны раз яна была ў аднатонным, светла-блакітным касцюме, але нават не пераступіла парог, толькі спытала, колькі часу ў яе на пакупкі.

— Жанчына ёсць жанчына, — задаволена выдыхнуў Сяргей Сяргеевіч, калі яны засталіся ўдвух. — Кажа, тут побач харошы гандлёвы цэнтр. А ведаеце, — разгаварыўся ён, — Волечка была маёй студэнткай. Адной з найлепшых студэнтак. Разумніца і прыгажуня. Ёй семнаццаць, мне трыццаць шэсць, уяўляеце — трыццаць шэсць! Мы вучыліся разам з яе бацькам. Ён, праўда, на тры курсы вышэй, але гэта не замінала нашаму сяброўству. Абодва закончылі аспірантуру пры ўніверсітэце, абодва засталіся ў ім працаваць. І тут з'явілася Волечка...

Сяргей Сяргеевіч на хвіліну задумаўся. У майстэрні пахла свежымі фарбамі. Праз расчыненую фортку шум машын на праспекце нагадваў шум марскога прыбою.

— У мяне тады яшчэ была сям'я. Ды і Волечка на чацвёртым курсе выскачыла замуж. Закончыла ўніверсітэт і надоўга прапала. А потым памерла яе маці. Для майго сябра гэта стала вельмі цяжкім ударам: што вы, у іх было такое каханне... У выніку — інсульт, Волечка закінула працу... Ну, яна неяк там дапамагала мужу займацца бізнесам, і амаль дзевяць гадоў фактычна пражыла ў бацькавай кватэры. Муж — што муж: угаворы наняць сядзелку, скандалы, развод. Можна сказаць, пакінуў яе ні з чым. Праўда, і ў самога на той час бізнес пачаў развальвацца. Ну, а калі бацька яе памёр, я прапанаваў ёй працу ў факультэцкай бібліятэцы. Яна шмат нацярпелася ў жыцці, Віктар Канстанцінавіч, паспрабуйце паглядзець на нашы з ёй адносіны з гэтага ракурсу.

«Глядзець на чужое жыццё — усё роўна што глядзець на месяц на небе: кожны раз убачыш толькі палову», — падумаў Віктар. Адкуль ён ведае, шчаслівая яна цяпер ці не? І пасля таго, як Сяргей Сяргеевіч раскрыўся яму, на гэтае пытанне стала яшчэ складаней знайсці адказ. Шчасце — калі ёсць грошы? Калі спакойнае жыццё і муж дзеля цябе гатовы на ўсё? Відаць, так. Але гэта і ёсць толькі тая самая бачная палова.

Мінулы раз, калі яна сядзела на крэсле каля стала, ён раптам заўважыў, як яны падобныя — ружа, якая перад сваім завяданнем, уражваючы апошняй, спелай прыгажосцю, здавалася, у нейкім гарачым напружанні ледзьве стрымлівала свае пялёсткі, што вось-вось гатовы былі выбухнуць і разляцецца, і жанчына, прыгажосць якой у гэтым узросце праз усю плоць, праз кожную клетачку дыхала жарам, што чакаў выпадковага ветру, каб ярка ўспыхнуць перад яе паступовым згасаннем. Ці была яна шчаслівая гэтай свайёй нябачнай яму паловай?

Сяргей Сяргеевіч і Вольга Іванаўна яшчэ тры ці чатыры разы наведалі яго майстэрню, пакуль ён нарэшце не сказаў:

— Ну, што ж, дні праз два можаце прыйсці, каб паглядзець на гатовы партрэт.

Яны ўжо былі на на лесвічнай пляцоўцы, як Вольга Іванаўна раптам спахапілася:

— Прабачце, я забыла ў вас сваю сумачку!

— О, у сумачцы сучаснай жанчыны больш каштоўнага, чым у Каралеўскай скарбніцы лонданскага Таўэра, — пажартаваў Сяргей Сяргеевіч.

Вольгі Іванаўны, здавалася, не было некалькі хвілін.

— Жанчыны не любяць спяшацца, у якой бы сітуацыі мужчыны іх не чакалі, — зноў пажартаваў Сяргей Сяргеевіч.

Віктар адчуў, як на твар яго гарачай хваляй набягае чырвань, і амаль подбегам пасляшаўся ў майстэрню.

Вольга Іванаўна спалохана і ў страшным недаўменні стаяла каля мальберта, на які быў устаноўлены падрамнік, абцягнуты халстом. З халста на Вольгу Іванаўну глядзела жанчына ў поўны рост, у якой няцяжка было пазнаць яе самую. На жанчыне быў неверагодна празрысты белы сарафан з рознакаляровымі матылькамі ніжэй калена — усё, што мастак палічыў мэтазгодным надзець на яе.

— Як вы маглі! — з адчаем у голасе ўскрыкнула Вольга Іванаўна і, з сілай адштурхнуўшы Віктара, які стаяў у яе на дарозе, выскачыла з майстэрні.

Яна з мужам не прыйшлі сюды ні праз два дні, ні праз тыдзень.

Маладая журналістка назірала, як два чалавекі — незнаёмая жанчына гадоў пяцідзесяці і мастак, якому яна не паспела задаць яшчэ некалькі пытанняў, — доўга моўчкі глядзяць адно аднаму ў вочы, і не ведала, як сябе паводзіць.

— Я думала, што тут будзе вісець той варыянт майго партрэта, які бачыла ў вашай майстэрні, — першай парушыла маўчанне жанчына, у голасе якой адчувалася напружанасць.

— Цяпер вы ведаеце, чаму я стараюся нікому не паказваць свае работы, пакуль іх не закончу.

— Але, наколькі я памятаю, вы збіраліся пісаць партрэт майго мужа.

— Так і ёсць, Вольга Іванаўна. Партрэт даўно гатовы і чакае ў майстэрні.

— Як? — здзівілася жанчына.

— Ну, каб напісаць мужчынскі патрэт на заказ, часцей за ўсё дастаткова двух-трох сеансаў.

— Спадзяюся, вы не намалявалі майго мужа ў выглядзе якога-небудзь дрэва? — прыкметна павесялела яна.

— Не, але гэта цудоўная ідэя, тым больш што, як бачыце, я люблю рабіць варыянты.

Яны абое нечакана гучна засмяяліся, тым самым як бы прабачаючы адно аднаго за тое, што месяц назад здарылася паміж імі ў майстэрні.

Маладая журналістка ў задуменні накіравалася праз усю залу да карціны, якую бачыла хвілін дваццаць назад. Цяпер да яе было цяжка падступіцца. На карціне стаяла ў поўны рост жанчына, і на яе з усіх бакоў зляталіся рознакаляровыя матылькі, і ўся яна была ў матыльках, якія дакладна паўтаралі контуры яе стройнай фігуры. Ногі жанчыны ўнізе пераходзілі ў адну тонкую лінію, а валасы ўтваралі сабой пышную чырвоную ружу з раскрытымі, нібы вось-вось гатовымі вырвацца ў неба пялёсткамі.

## З архіўных крыніц

# КІНЕМАТОГРАФ ПАТРАБУЕ НОВЫХ КАДРАЎ! ГОД 1953...

**«Загадчыку аддзела мастацкай літаратуры і мастацтва ЦК КП Беларусі тав. Буславу К. П.**
**Праўленне Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР дасылае Вам план мерапрыемстваў ССП БССР па паляпшэнню работы ў галіне кінадраматургіі, распрацаваныя намі ў сувязі з даручэннем бюро ЦК КПБ.**
**Сакратар Праўлення ССП БССР Пав. <...> Кавалёў».**

**Перш чым звярнуцца да самога зместу «плана мерапрыемстваў», які разам з суправаджальнай запіскай пісьменніка і літаратурнага чыноўніка са стажам Паўла Нічыпаравіча Кавалёва захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, звернем увагу на дату, якой пазначаны дакумент, — 5 сакавіка 1953 года... Менавіта ў гэты дзень з Саюза Савецкіх Пісьменнікаў БССР «выправіўся» дакумент у высокую партыйную інстанцыю. Важная папера паступіла ў ЦК партыі 6 сакавіка. Загадчык аддзела мастацкай літаратуры размашыстым почыркам пазначыў: «В дело». Збоку ёсць яшчэ адна храналагічная пазнака: «7. III. 53 г.». Відаць, гэта ўжо часавую гісторыю важнай паперы прадоўжыў справаводца, перадаючы ліст з пісьменніцкай арганізацыі ў «цянёты архіваў». Ніякай жа рэзалюцыі на плане мерапрыемстваў альбо на суправаджальным лісце Паўла Кавалёва няма... Даручэнне бюро ЦК КПБ пісьменнікі выканалі, склаўшы план мерапрыемстваў, — і дастаткова!..**


Фільм па п'есе Крапівы «Хто смяецца апошнім» быў зняты ў далёкім 1954-м.

5 сакавіка 1953 г., вечарам, на 75-м годзе жыцця памёр кіраўнік Савецкай дзяржавы — Старшыня Савета Міністраў СССР і на той час Сакратар ЦК КПСС (Генеральным сакратаром ён перастаў быць яшчэ ў 1934-м; хоць, зразумела, і кіраўніцтва Камуністычнай партыяй было на ім як на першай асобе) Іосіф Вісарыёнавіч Сталін. Яго знайшлі ў ноч з 1 на 2 сакавіка ахоўнікі ў малой сталовай на Бліжняй дачы ў Кунцава. Правадыр, які наводзіў страх і выклікаў захапленне мільёнаў людзей вялікай Савецкай краіны, ляжаў у бездапаможным стане... Толькі 4 сакавіка было абвешчана пра хваробу Сталіна, былі надрукаваны і перадаваліся па радыё бюлетэні пра стан яго здароўя. Згадваліся прыкметы цяжкага стану: інсульт, страта свядомасці, параліч цела, агенальнае дыханне. У той самы дзень было склікана экстраннае пасяджэнне Бюро Прэзідыума ЦК КПСС. На пасяджэнні была спынена дзейнасць Бюро. Яго зліл з Прэзідыумам ЦК. Рэфармацыі ажыццявілі і ў дачыненні да ўрада СССР. Урад узначаліў Георгій Маленкоў... Словам, ішла дзяльба ўлады... Пра смерць Сталіна абвясцілі па радыё 6 сакавіка ў 6 гадзін раніцы. 6—9 сакавіка савецкі народ развітваўся са Сталіным. Па ўсёй краіне была абвешчана жалоба. Пахаванне прайшло 9 сакавіка... Якімі клопатамі жылі ў той час у рэспубліканскім ЦК — можна толькі здагадвацца. І, тым не менш, жыццё ішло, прадаўжалася. Мо і дакумент, прынесены Буслаеву, ужо не ўяўляў ранейшай цікавасці?..

Кароткае адступленне. Павел Нічыпаравіч Кавалёў (1912—1995), які падпісаў справаздачу ў ЦК, — празаік, драматург, перакладчык. Член Саюза пісьменнікаў — з 1945 года. З 1943 да 1944 гг. служыў старшым памочнікам начальніка аддзялення друку ў Цэнтральным штабе партызанскага руху. Пасля расфарміравання штаба быў памочнікам спачатку трэцяга сакратара ЦК КП(б)Б, затым — першага сакратара ЦК КП(б)Б. З 1946 г. — адказны сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў. У 1967—1972 гг. — галоўны рэдактар часопіса «Полымя». Аўтар некалькіх кніг прозы («Прага бою», «Падзенне Хвядоса Струка», «Дзень першы, ноч апошняя», Пакінь нас, трывога»), некалькіх п'ес («Подзвіг», «Рабочая кроў» і інш.). Пісаў і творы для дзяцей.

Казімір Паўлавіч Буслаў (1914—1983) — беларускі савецкі філосаф. У 1947 годзе скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК ВКП (б). У 1944—1948 гг. — лектар ЦК КП(б)Б. У 1951 годзе Буслаў закончыў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. У 1951—1956 гг. — загадчык аддзела мастацкай літаратуры ЦК КПБ. У 1956 годзе прызначаны дырэктарам Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук БССР. Зрабіў паспяховую кар'еру ў навуцы. Абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыю па філасофіі. Быў абраны: спярша — членам-карэспандэнтам АН БССР, затым — правадзейным акадэмікам АН БССР (1972). Апублікаваў болей за 60 навуковых прац, сярод іх — чатыры манаграфіі. Характэрнай з'яўляецца назва адной з іх: «Сацыяльнае адзінства, супярэчанні, адказнасць». Адна з апошніх кніг партыйнага філосафа — манаграфія «Фарміраванне сацыяльнага ў чалавеку», якая была выдадзена ў Мінску ў 1980 годзе.

Што ж за мерапрыемствы планавалі ажыццявіць у Саюзе пісьменнікаў у 1953 годзе як найхутчэй?.. План, зацверджаны Прэзідыумам ССП БССР яшчэ 25 лютага 1953 г., называецца наступным чынам: «Мерапрыемствы Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР па паляпшэнню работы ў галіне кінадраматургіі». А мерапрыемствы наступныя: *«1. Для актывізацыі і павышэння тэарэтычных ведаў маладых сцэнарыстаў арганізаваць у маі месяцы г.г. дзесяцідзённы семінар па кінадраматургіі. Для чыткі лекцый, правядзення творчых гутарак па пытаннях кіно і кіраўніцтва практычнымі заняткамі на семінары прасіць праўленне ССП СССР накіраваць у Мінск трох лепшых кінасцэнарыстаў, а Міністэрства Кінематаграфіі БССР — вылучыць для гэтай жа мэты групу кінарэжысёраў.*

*2. Пісьменнікам, якія зрабілі творчыя заяўкі на напісанне сцэнарыяў і маюць патрэбу ў паездках для збору матэрыялаў, выдаць творчыя камандзіроўкі са сродкаў ССПБ.*

*3. Звярнуцца з пісьмом у абласныя аддзяленні ССП з мэтай выяўлення і прыцягнення ў кіно новых кадраў маладых кінадраматургаў з перыферыі.*

*4. Абавязаць секцыю драматургіі і кіно абавязкова абмяркоўваць усе лібрэта і сцэнарыі беларускіх пісьменнікаў да здачы іх у кінастудыю.*

*5. Узяць пад непасрэдны нагляд і творчую дапамогу работу пісьменнікаў М. Паслядовіча, І. Шамякіна, А. Маўзона, А. Макаёнка. К. Губарэвіча, В. Вольскага, М. Блісцінава, якія працуюць над новымі сцэнарыямі.*

*6. Паставіць перад кіраўніцтвам кінастудыі «Беларусьфільм» пытанне аб абавязковым прымацаванні к пісьменнікам, якія пішуць сцэнарыі, у якасці кансультантаў вопытных кінарэжысёраў.*

*7. Для папулярнасці кінематаграфічных твораў прасіць Белзяржвыдавецтва выдаць асобным зборнікам сцэнарыі беларускіх пісьменнікаў («Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона, «Советская Беларусь» К. Губарэвіча, «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, «Рассвет» М. Паслядовіча і «Белая вежа» М. Блісцінава)».*

Які ж плён адбыўся ў выніку? Што было здзейснена ў беларускім кінематографе ў 1953-м і ў наступныя гады?.. Да гледача прыйшла карціна «Пяюць жаваранкі» (яшчэ ў 1950 годзе Кандрат Крапіва апублікаваў аднайменную п'есу; рэжысёрамі фільма выступілі Уладзімір Корш-Саблін і Канстанцін Саннікаў), а яшчэ — кінафільмы «Дзеці партызана», «Хто смяецца апошнім», «Беларускі канцэрт», «Зялёныя агні», «Несцерка», «Міколка-паравоз»... У 1958 годзе на экраны выйшаў неблагі фільм «Чырвонае лісце» па сцэнарыі Аркадзя Куляшова і Алеся Кучара. Дарэчы, Кучар напісаў (у суаўтарстве з М. Фігуроўскім) таксама і сцэнарый «Гадзіннік спыніўся апоўначы». І «Міколка-паравоз», і «Чырвонае лісце», і «Гадзіннік спыніўся апоўначы» некалькі дзесяцігоддзяў не сыходзілі з экранаў кінатэатраў, шмат разоў былі паказаны па тэлебачанні. І ўсё ж масавага ўздзелу пісьменнікаў у беларускім кінапрацэсе не атрымалася. Прычыны на тое самыя розныя. І не толькі пісьменніцкая супольнасць вінаватая ў тым, што кінашэдэўраў усё ж не з'явілася...

**Кастусь ЛЕШНІЦА,**
**Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.**